ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**

# ЗАГАД

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

# ПРИКАЗ

26.07.2024 № 554

г. Гомель

г. Гомель

Аб правядзенні
рэспубліканскага конкурсу-турніру
«Дзівосы краю майго»

У адпаведнасці з пісьмом установы адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» ад 18.07.2024 №686, з мэтай фарміравання ў навучэнскай моладзі патрыятычных якасцей і паглаблення пачуцця любові да сваёй краіны праз далучэнне іх да даследавання жыцця і дзейнасці адметных асоб свайго краю, пазнання гісторыі, культуры і прыроднай спадчыны малой радзімы
ЗАГАДВАЮ:

1. Арганізаваць правядзенне рэспубліканскага конкурсу-турніру «Дзівосы краю майго» ў рамках рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта «Збяры Беларусь у сваім сэрцы» (далей – конкурс-турнір).

2. Адказнасць за арганізацыю і правядзенне абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу-турніру, прадстаўленне конкурсных матэрыялаў на рэспубліканскі этап ускласці на дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі абласны цэнтр турызму і экалогіі дзяцей і моладзі» (далей – Цэнтр турызму і экалогіі) Марозава А.Л.

3. Кіраўнікам аддзелаў адукацыі райвыканкамаў, аддзелаў адукацыі, спорту і турызму адміністрацый раёнаў г.Гомеля, упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама:

3.1. забяспечыць удзел навучэнцаў аб'яднанняў па інтарэсах устаноў адукацыі (індывідуальна) ва ўзросце ад 14 гадоў у рэспубліканскім конкурсе-турніры ў адпаведнасці з умовамі правядзення рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта «Збяры Беларусь у сваім сэрцы» (далей – умовы) (дадатак 1);

3.2. накіраваць электронны варыянт брашуры пераможца раённага этапу для ўдзелу ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу-турніру з прадстаўленнем пратаколаў пасяджэння журы ў Цэнтр турызму і экалогіі на e-mail: kraeved-tur@gomelcte.by да 12 кастрычніка 2024 г.;

016665

3.3. прыняць да ведама, што абласны этап рэспубліканскага конкурсу-турніру (краязнаўчая віктарына па матэрыялах брашур пераможцаў раённых этапаў) будзе праходзіць 1 лістапада 2024 г. у рамках абласнога краязнаўчага конкурсу-алімпіяды на базе дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія №36 г.Гомеля ім.І.Мележа» (навучэнец уключаецца ў склад каманды раёна).

4. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Кавалёву А.Г.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Р.І.Смірноў

Намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення
А.Г.Кавалёва

Начальнік аддзела
А.І.Клачкова

Клачкова
Вербавікова 262 272

Дадатак
да загада начальніка галоўнага
ўпраўлення адукацыі
26.07. 2024 г. № 554

# УМОВЫ
## правядзення рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта «Збяры Беларусь у сваім сэрцы»

*(Дадатак да пісьма ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» ад 18.07.2024 №686)*

**1. Агульныя палажэнні**

**1.1.** Рэспубліканскі грамадзянска-патрыятычны праект «Збяры Беларусь у сваім сэрцы» (далей – рэспубліканскі праект) праводзіцца ў адпаведнасці з планам работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2024 год і ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021 – 2025 гады.

**1.2.** Арганізатарам рэспубліканскага праекта з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне рэспубліканскага праекта ажыццяўляецца ўстановай адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – рэспубліканскі цэнтр).

У 2024 годзе ў рамках рэспубліканскага праекта праводзіцца рэспубліканскі конкурс-турнір «Дзівосы краю майго» (далей – конкурс-турнір).

**2. Мэта і задачы рэспубліканскага конкурсу-турніру**

Конкурс-турнір праводзіцца з мэтай фарміравання ў моладзі патрыятычных якасцей, паглыблення пачуцця любові да сваёй краіны праз далучэнне іх да даследавання жыцця і дзейнасці адметных асоб свайго краю, да пазнання гісторычнай, культурнай і прыроднай спадчыны малой радзімы.

Дасягненне пастаўленай мэты ажыццяўляецца праз рашэнне наступных задач:

масавае ўключэнне навучэнцаў у дзейнасць па даследаванні, вывучэнні, аднаўленні (адраджэнні) і выкарыстанні аб’ектаў «страчанай спадчыны»;

захаванне і выкарыстанне матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей малой радзімы, распаўсюджванне інфармацыі аб іх і папулярызацыя на карысць інтарэсаў грамадства;

даследаванне і папулярызацыя жыцця і дзейнасці выбітных асоб свайго краю;

выхаванне беражлівых адносін да гісторыі і культуры краю, адказнасці за захаванне культурна-гістарычнай спадчыны продкаў;

стварэнне іміджу рэгіёна як прывабнага турысцка-экскурсійнага і культурна-пазнавальнага аб’екта;

стварэнне ўмоў для раскрыцця пазнавальных і творчых здольнасцей навучэнцаў.

**3. Удзельнікі рэспубліканскага конкурсу-турніру**

У конкурсе-турніры прымаюць удзел навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах устаноў адукацыі ва ўзросце ад 14 гадоў.

**4. Тэрмін рэалізацыі рэспубліканскага конкурсу-турніру**

Конкурс-турнір праводзіцца ў перыяд з ліпеня па лістапад 2024 года ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

першы этап – ва ўстановах адукацыі;

другі этап – раённы, раённы для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне, гарадскі (акрамя г.Мінска);

трэці этап – абласны, Мінскі гарадскі;

чацвёрты этап – рэспубліканскі. Рэспубліканскі этап конкурсу-турніру праводзіцца ў 2 туры: тэарытычны і практычны.

**5. Парадак правядзення рэспубліканскага конкурсу-турніру**

**5.1.** На першым этапе конкурсу-турніру навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах праводзяць краязнаўчыя даследаванні жыцця і дзейнасці выбітных асоб свайго краю, выяўляюць матэрыяльныя і нематэрыяльныя каштоўнасці сваёй малой радзімы, якія можна ўмоўна аднесці да «страчанай спадчыны» (не маюць яўнай праявы на сённяшні дзень).

Падчас даследаванняў удзельнікі конкурсу-турніру працуюць з архіўнымі дакументамі, матэрыяламі археалагічных даследаванняў, публікацыямі ў спецыяльных навуковых выданнях, матэрыяламі музеяў і г.д.

Аб’ектамі пільнай цікаўнасці ўдзельнікаў конкурсу-турніру становяцца аб’екты «страчанай спадчыны», амаль забытыя ў народзе, ці зруйнаваныя часам і людзьмі.

«Страчанай спадчынай» можа быць нематэрыяльнае праяўленне творчасці чалавека (звычаі, традыцыі, абрады, фальклор (вусная народная творчасць, легенды і паданні), традыцыйная маўленчая культура, гаворка, змест геральдычных аб’ектаў, уласных геаграфічных назваў (тапонімаў) і інш.), а таксама створаныя чалавекам або цесна звязаныя з яго дзейнасцю матэрыяльныя аб’екты (помнікі гісторыі, прыроды, архітэктуры, археалогіі, горадабудаўніцтва, мастацтва, дакументальныя помнікі і інш.). Аб’екты «страчанай спадчыны» павінны з’яўляцца аўтэнтычнымі і мець гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае значэнне з пункту гледжання ўдзельніка конкурсу-турніру. Аб’ектам даследаванняў таксама з’яўляюцца

малавядомыя, але выбітныя, па меркаваннях удзельнікаў конкурсу-турніру, землякі, хто зрабіў свой унёсак у адметнасць дадзенага рэгіёна.

Па вынікам даследавання ствараецца брашура «Дзівосы краю майго», у якой змяшчаецца матэрыял аб «топ-3» (па кожнай пазіцыі 3, усяго 9) аб’ектах «страчанай спадчыны» – найбольш значных матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцях малой радзімы, а таксама аб выбітных асобах свайго краю.

Брашура (pdf файл) уключае: тытульны ліст, інфармацыю аб аб’ектах, карту-схему з адзначанымі 9 адметнасцямі, спіс выкарыстаных крыніц. Інфармацыя аб аб’ектах павінна быць прадстаўлена лагічна ў адпаведнасці з наступнай структурай: месцазнагоджанне аб’екта, гістарычная даведка, знішчэння (поўнае ці частковае) аб’екта, унёсак «выбітных» асоб у культурнае і (або) духоўнае жыццё малой радзімы, ці уплыў на ход гістарычнага развіцця краю (калі мае месца). Апісанне аб’ектаў дапаўняецца фотаздымкамі, схемамі, малюнкамі. Пры выкарыстанні літаратуры неабходна даваць спасылкі ў тэксце (калі матэрыял аўтарскі, то гэта таксама неабходна адзначыць). Інфармацыя аб адным аб’екце павінна займаць не больш 2 старонак.

**5.2.** На другім этапе ацэньваюцца брашуры, дасланыя ўстановамі адукацыі. Ад кожнага раёна вызначаецца 1 пераможца і прызёры. У трэцім этапе ўдзельнічае адзін пераможца раённага этапу.

Крытэрыі ацэнкі брашуры:

лагічнасць і змястоўнасць прадстаўленай інфармацыі аб аб’екце;

значнасць аб’екта для сваёй мясцовасці (ці краю);

крэатыўнасць афармлення;

самастойнасць у зборы і аналізе матэрыялу;

наяўнасць спасылак на крыніцы.

**5.3.** На трэцім этапе абласныя, Мінская гарадская ўстановы дадатковай адукацыі размяшчаюць на сайце распрацаваныя брашуры кожнага пераможцы другога этапу для знаёмства з імі ўдзельнікаў. У вызначаны час праводзіцца краязнаўчая віктарына, якая распрацавана на падставе мэтэрыялаў брашур.

Па выніках віктарыны 5 навучэнцаў, якія набралі вышэйшы бал, адбіраюцца для ўдзелу ў чацвёртым этапе.

**5.4.** У рэспубліканскім этапе ўдзельнічаюць 7 сборных каманд ад абласцей і г.Мінска.

Кожнай камандзе да 25 кастрычніка 2024 года неабходна прайсці электронную рэгістрацыю на платформе «Патрыёт.by» (https://patriot.rcek.by/), якая будзе змешчана ў модулі «Афіша падзей». Рэгістрацыя ўключае прадстаўленне кантактных дадзеных аб аўтарах брашур і кіраўніку каманды, а таксама спасылку на брашуры ўдзельнікаў.

**5.5.** Рэспубліканскі этап праводзіцца ў вочным фармаце ў 2 туры: тэарытычны і практычны. Дата і месца правядзення заключнага этапу будзе даведзена да ведама ўдзельнікаў дадаткова.

Для падрыхтоўкі каманд да ўдзелу ў рэспубліканскім этапе напярэдні (за 2 тыдні) на сайце рэспубліканскага цэнтра (https://rcek.by/) змяшчаюцца брашуры ўдзельнікаў дадзенага этапу.

**5.5.1.** Першы тур (тэарытычны) уключае заданні адкрытага і закрытага тыпу на веданне «страчанай» гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі. Заданні будуць распрацаваны на аснове матэрыялу, прадстаўленага ў брашурах удзельнікаў.

Тэарэтычны тур складаецца з некалькіх частак:

«інтэлект-буквар» (каманды адказваюць на пытанне, адказ на якое пачынаецца з літары згодна беларускага алфавіта);

«3х10» (пытанні размеркаваны па трох тэматычных катэгорыях (матэрыяльныя, нематэрыяльныя аб'екты, выбітныя асобы), якія ўключаюць дзесяць рознаўзроўневых пытанняў у кожнай катэгорыі).

**5.5.2.** У другім туры (практычны) каманда за пэўны час павінна скласці экскурсію-імправізацыю па аб'ектах (з пераліку прадстаўленных у брашурах), якія атрымалі па выніках жараб'ёўкі.

Крытэрыі ацэнкі практычнага тура:

лагічнасць пабудовы экскурсіі;

экскурсійная падача інфармацыі;

паўната і дасканаласць звестак аб аб'ектах;

адказы на пытанні.

**5.5.3.** Каманды-пераможцы і прызёры конкурсу-турніру вызначаюцца па выніках двух тураў.

**5.5.** Аўтары, удзельнікі конкурсу, даюць згоду арганізатарам на публікацыю сваіх работ, публічную дэманстрацыю і некамерцыйнае выкарыстанне матэрыялаў (з захаваннем аўтарскіх правоў) з мэтай папулярызацыі рэспубліканскага праекта.

Дадатковая інфармацыя і кансультацыі па тэлефоне: 8017 3200633 (аддзел краязнаўства і патрыятычнага выхавання).

**5.6. Падвядзенне вынікаў рэспубліканскага конкурсу-турніру**

Пераможцы і прызёры конкурсу-турніру ўзнагароджваюцца дыпломамі і прызамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дыпломамі ўдзельнікаў рэспубліканскага цэнтра.

**6. Арганізацыйныя камітэты**

Для арганізацыі і правядзення конкурсу-турніру на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсу-турніру;

даводзіць інфармацыю аб конкурсе-турніры да ведама ўстаноў адукацыі;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсу-турніру;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсу-турніру;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсу-турніру ў сродках масавай інфармацыі.

Арганізацыйнае правядзенне конкурсу-турніру забяспечваюць:

на першым этапе – установы адукацыі;

на другім этапе – структурныя падраздзяленні гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

на трэцім этапе – структурныя падраздзяленні абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

на заключным этапе – Міністэрства адукацыі, рэспубліканскі цэнтр.

Для падвядзення вынікаў конкурсу-турніру на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы.

Журы на ўсіх этапах конкурсу-турніру:

ацэньвае праекты, якія прадстаўлены ўстановамі адукацыі;

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсу-турніру;

прадстаўляе рашэнні (пратаколы) па выніках конкурсу-турніру і іншую неабходную інфармацыю ў адпаведныя аргкамітэты.

**7. Фінансаванне рэспубліканскага праекта**

Фінансаванне рэспубліканскага праекта ажыццяўляецца:

на першым этапе – установай адукацыі;

на другім этапе – за кошт раённых, гарадскіх бюджэтаў, прадугледжаных на правядзенне мерапрыемстваў;

на трэцім этапе – за кошт сродкаў абласных бюджэтаў і бюджэту г.Мінска, прадугледжаных на правядзенне мерапрыемстваў;

на заключным этапе – Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжанага на іншыя выдаткі ў галіне адукацыі (план мерапрыемстваў па рэалізацыі падпраграмы 10 «Маладзёжная палітыка» на 2024 год Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021 – 2025 гады).

Для фінансавання рэспубліканскага праекта на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.